# Выйшаў чарговы нумар часопіса «Веснік сувязі»

**Па слядах BUDEXPO-2026.** Пра тое, як алгарытмы мяняюць фізіку будаўнічага рынку, ШІ становіцца памочнікам архітэктара і як аблічбавалі жыццёвы цыкл такога капрызнага прадукту, як таварны бетон, чытайце ў матэрыялах рубрыкі «Тэма нумара».

**Ад кропкавых рашэнняў — да экасістэм.** Як ШІ-агенты і інтэлектуальныя платформы ўжо працуюць у фінансавых установах Беларусі — разбіраем на прыкладзе кейсаў Альфа Банка, Мтбанка і Ашчад Банка ў блоку «Агентурная сетка».

**Глабальны крызіс або стымул да змен? У рубрыцы «Аналітыка** — ключавыя тэзісы даклада Сусветнага паштовага саюза «Стан паштовага сектара 2026». Пра тое, чаму звыклыя падыходы больш не працуюць, як новыя правілы трансгранічнага гандлю перакроілі сусветную лагістыку і за якімі лічбавымі стратэгіямі стаіць будучыня глабальнай паштовай сеткі — чытайце ў матэрыяле.

**Сусветны дзень пошты.** У кастрычніку ў работнікаў РУП «Белпошта» – другое прафесійнае свята, і лепшыя з іх атрымліваюць заслужаныя ўзнагароды. Але яшчэ да гэтага РУП «Белпошта» правяла рэспубліканскія першынствы прафесійнага майстэрства сярод вадзіцеляў, паштальёнаў і спецыялістаў па паштовай дзейнасці. Вынікі – у рубрыцы «Конкурсы».

**Сезонныя клопаты.** Зіма – на парозе, значыць пара падумаць пра дровы. У верасні лясгасы краіны запусцілі адзіную вэб-платформу і чат-бота для анлайн-афармлення заявак на драўнянае паліва. Падрабязнасці – у матэрыяле «За дровамі – не ў лес, а на сайт».

*За рамкамі друкаванай версіі «Веснік сувязі» расказвае пра сувязь і «лічбу» – цяпер у тэлеграм-канале* @VSbel_by

*Толькі актуальны парадак дня – чытайце і падпісвайцеся!*

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/vyyshau-chargovy-numar-chasopisa-vesnik-suvyazi-1*